ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 118 (1085) | ПЯТНІЦА, 23-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

УВАЗЕ ЮНКОРАЎ

У ПЯТНІЦУ 23-га МАЯ, А 7-АЙ ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ, у памяшканьні рэд. газ. „Чырвоная Зьмена“ адбудзецца пазачарговая агульна-гарадзкая нарада юнкораў.

НА АБВЕСТЦЫ ДНЯ:

1. Аб падрыхтоўцы да зьезду партыі
2. Аб месячніку «Чырвонай Зьмены“

Юнкоры ад усіх паседжаньняў і сходаў аслабаняюцца.
Яўка абавязкова

РЭДАКЦЫЯ.

VIII Менская Акруговая Партыйная Конфэрэнцыя

Спрэчкі па дакладах аб рабоце ЦКК КП(б)Б і АКК

На ранішнім паседжаньні 21-га мая пачаліся спрэчкі па дакладах тав. Калініна і тав. Дамброўскага.

Спрэчкі прынялі надзвычайна ажыўлены характар пры ўсебаковым абмеркаваньні дакладаў аб рабоце КК. Адзначаючы цьвёрдае правядзеньне ў жыцьцё політыкі партыі, таварышы спыняліся на сумесных задачах, якія стаяць перад ЦКК і АКК, падкрэсьлілі неабходнасьць яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы за генэральную лінію партыі.

— ЦКК і АКК,—кажа тав. Стырнэ—правялі вялізарную работу па чыстцы партыі і падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату, якая зараз і праводзіцца. Чыстка партыі ўзьняла вялікі ае аўтарытэт, аб чым сьведчыць значны прыліў у партыю рабочых ад варштату, батрацтва і беднаты вёскі.

Закранаючы пытаньні чысткі коопэрацыйнага апарату, тав. Стырвэ адзначыў неабходнасьць спрашчэньня тавара-праводзячай сеткі. Гэтая работа, правільнае разьмеркаваньне тавараў, асабліва дэфіцытных, павінны заняць асаблівае месца ў рабоце Наркомгандлю.

— У рабоце будаўнічых органаў,—кажа тав. Бэйлін,—маюцца вялікія нявязкі. У прыватнасьці—няўвязка ў рацыянальным скарыстаньні інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу, у мобілізацыі для будаўніцтва ўнутраных рэсурсаў і г. д.

Тав. Заяц, адзначаючы правільнасьць лініі ЦКК і АКК, гаворыць аб тым, што, побач з вялікімі дасягненьнямі, яшчэ недастаткова праведзена работа ў пытаньнях зьмены мэтадаў партыйнага рэагаваньня на цэлы рад шкодных зьявішчаў, аб чым у свой час выступаў у друку тав. Яраслаўскі. Пры гэтым прамоўца завастрае ўвагу на такія зьявішчы ў рабоце АКК, калі паасобныя кантрольныя зьвеньні складаюць шматтомныя справы, якія цягнуцца па некалькі месяцаў і ў выніку несваечасовага рэагаваньня не даюць ніякага эфэкту. Трэба больш зьвярнуць увагі на работу сэкцыі РСІ ва ўстановах, бо значная колькасьць з іх амаль што не працуе, а гэта зьяўляецца прычынай таго, што рабочы і селянін абмінаюць свае органы і пасылаюць хадакоў у Менск у цэнтральныя органы, каб адтуль рэагавалі.

— Кантрольныя органы,—падкрэсьлівае т. Заяц,—яшчэ недастаткова рэагуюць на самакрытыку ў друку, і рабселькораўскія заметкі, а таксама недастаткова праводзяць барацьбу з парушэньнямі рэволюцыйнай законнасьці.

Тав. Левін падкрэсьлівае, што ў шэрагу ячэек з парт. парушэньнямі змагаюцца шляхам накладаньня дзесяткаў парт. спагнаньняў і недастаткова займаюцца шляхам політ-выхаваўчай работы сярод радавых членаў партыі.

Многія ячэйкі ня выконваюць дырэктыў, якія былі дадзены правяркомам, а гэтым пытаньнем партыйныя і кантрольныя органы павінны заняцца ў бліжэйшы час.

Тав. Ленц гаворыць аб неабходнасьці большага практыкаваньня выездаў членаў ЦКК і АКК на месцы у ячэйкі для разгляду спраў.

* * *

На ранішнім паседжаньні 22 мая працягваліся спрэчкі па дакладах аб рабоце ЦКК і АКК.

Генэральная чыстка згуртавала партыйныя шэрагі,—кажа т. Смаль,—дзякуючы генэральнай чыстцы КП(б)Б і правільнаму кіраўніцтву чысткай ЦКК компартыя ачысьцілася ад непатрэбнага хламу, які перашкаджаў правядзеньню правільнай ленінскай лініі.

Далей у сваім выступленьні тав. Смаль спыняецца на тым, што ЦКК і АКК мала ўдзялялі ўвагі кантролю нашага кіраўніцтва і рацыяналізацыі прамысловасьці.

У сваім выступленьні т. Тамашэўскі застанавіўся на тым, што ЦКК правяла вялікую работу ў сэнсе правільнага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі. Ён указаў, што ЦКК па бальшавіцку ўдарыла па цiскачах самакрытыкі з Гомелю. ЦКК у сваёй рабоце па-ленінскі стаяла за разгортваньне самакрытыкі.

Пасьля выступленьня тав. Канашэвіча, які застанавіўся на бюрократычных адносінах Белсельбрэсту да забясьпечаньня колгасаў і савгасаў і выступленьня т. Аляксеевай, конфэрэнцыя заслухала заключнае слова тав. Калініна і Дамброўскага.

У прынятым першым пункце рэзолюцыі па дакладу тав. Калініна гаворыцца аб тым, што VIII парт.конфэрэнцыя, абгаварыўшы даклад аб рабоце ЦКК з часу ад 12 зьезду, прызнае, што работа ЦКК праходзіла ў поўнай адпаведнасьці з ленінскай лініяй партыі і задачамі рашучай барацьбы з усялякімі ухіламі ад генэральнай лініі партыі. Конфэрэнцыя лічыць лінію ЦКК правільнай і работу здавальняючай.

Для распрацоўкі рэзолюцыі па дакладу ЦКК абрана камісія з 11 чалавек.

Па справаздачы АКК конфэрэнцыя таксама прыняла першы пункт рэзолюцыі, у якім лічыць політычную і організацыйную лінію АКК КП(б)Б правільнай і адначасова адзначае, што АКК выканала ўскладзеныя на яе задачы па чыстцы акруговай парт. організацыі і ў сваёй рабоце абараняла адзінства ленінскай партыі. Для распрацоўкі рэзолюцыі абрана таксама камісія ў складзе 14 чал.

* * *

На вячэрнім паседжаньні пасьля прывітаньняў рабочых Кастрычнікаўскага раёну (Менск) і чырвонаармейскіх частак №-кай дывізыі з дакладам аб рабоце АК КП(б)Б выступіў тав. Славінскі.

Ліст з Нямеччыны

Паход 100.000

(Ад нашага спэцыяльнага корэспондэнта)

На 715 грузавіках і асобых вагонах прыбыў у Лейпцыг транспарт маладых комуністых. Ужо ў нядзелю чужаземцаў (прыежджых) налічвалася каля 30.000. Гэта трэба адзначыць, як вялікае дасягненьне юных комуністых.

Прыбыла значная колькасьць фабрычных дэлегацый і таксама дэлегацый так званых юных соцыялістых. Ужо ў нядзелю ранічной капэля юных комуністых выканала 5 вулічных концэртаў на якіх прысутнічалі тысячы жыхароў Лейпцыгу. Да поўдню ва ўсіх частках гораду было весела. Узьнікшыя з маленькіх груп дэмонстрацыі хутка ператварыліся ў акруговыя дэмонстрацыі, якія пад кіраўніцтвам шматлікіх транспарантаў з паролямі рабочай моладзі з чырвонымі сьцягамі пацягнуліся да цэнтру гораду. Дысцыплінаванымі калёнамі з моладзьдзю маршыравалі шматлікія масы рабочых, якіх усюды віталі. Паход на Аўгустпляц (вуліца), дзе адбылася інтэрнацыянальная дэмонстрацыя, працягваўся паўтары гадзіны. У час паходу былі ўзьняты тры чырвоныя сьцягі з сярпом і молатам. Пад шумныя ўхвалы разгульвала стотысячная маса юных комсамольцаў па грандыёзнай дэмонстрацыі. Поліцыя ў гэты момант

Калі тав. Тэльман перадаў баявое прывітаньне дню моладзі, удзельнікі дэмонстрацыі яго горача прывіталі. У гэты самы момант на Грымлішэнштрасэ адбылася жорсткая сутычка. Прыватны аўтамабіль спрабаваў провакацыйным шляхам, не зьвяртаючы ўвагі на протэсты, праехаць праз масы. Юныя комуністыя ўступілі з седакамі у перагаворы, на якія тыя груба адказвалі. У выніку яны былі зьбіты натоўпам. Калі інцыдэнт быў вычарпан, прышла поліцыя пад кіраўніцтвам лейтэнанта ГАЛЬЛЕ з аголенымі рэвольвэрамі.

Лейтанант Гальле стаў на падножку аўтамабіля і патрабаваў разыйсьціся. Праз некалькі сэкунд ён стрэліў у комсамольца Дыба, пачалі страляць і поліцэйскія. Адзін з ахоўных ланцугоў дзякуючы страляніне прымушан быў раскідацца.

Юныя комуністыя аказалі адпор разьюшаным да шалёнства поліцэй-казакам. Лейтэнант Гальле і другі галоўны вахмістр былі зьбіты абураным да бясконцнасьці натоўпам, многія поліцэйскія былі цяжка паранены. Гэтае здарэньне адбылося ў вельмі кароткі час, так што значная колькасьць зусім ня ведала аб разыграўшымся.

На пляцы выступілі яшчэ з прамовамі да мас горача прывітаны тав. Генц Нэйман, прадстаўнік ЦКК КПН і замежныя дэлегаты. Пасьля 6 гадзін дэмонстрацыйнае шэсьце, якое складалася звыш як з 30000 чалавек пад кіраўніцтвам т. Тэльмана і прадстаўнікоў ЦК КСМ рушылася ў дарогу. Грандыёзная дэмонстрацыя прашла праз рабочыя кварталы. Гэта было трыумфальнае шэсьце, якога Лейпцыг яшчэ ня бачыў. Усе вуліцы былі заняты шарэнгамі дзесяткаў тысяч людзей. Юныя комуністыя маршыравалі групамі ў 8 і 12 радоў, спаяныя жалезнай дысцыплінай. Мноства транспарантаў і розных плякатаў выражалі патрабаваньні рэволюцыйнай моладзі.

Самкнутымі шэрагамі маршыравала каля 4-хтысяч чалавек чырвоных франтавікоў у поўнай форме. Заклікі чырвоных франтавікоў віталіся прысутнымі.

На пляцы дзяржаўнага суда, ЦК партыі і моладзі зрабілі астаноўку і на працягу двух з паловай гадзін прапускалі шэсьце.

За СССР, Комінтэрн і КІМ падаваліся выклікі. (Адзін з рабочых). На адной з падвод, дастаўленых з гор. Хэмніца, быў надпіс: „Мы абараняем СССР“, „Вайна вайне“. Калі шэсьце скончылася на пляцы, яшчэ засталося каля 600 чалавек на якіх напала ўзброеная поліцыя. Утварыўся патройны ахоўны ланцуг з комсамольцаў і анты-фашыстых. Поліцыі прышлося праламаць ланцуг. Адбылося новае крывапраліцьце.

Лейпцыг, В. Рорляпер.



Лейпцыгскія комсамольцы малююць лёзунгі на трыбуне



Збудаваная трыбуна у Лейпцыгу

Абвостраньне эканамічнага крызісу ў Японii

ТОКІЁ, 20. Экономічны крызіс у Японіі абвастраецца. Беспрацоўе расьце падобна сьнежнай лавіне і не паддаецца падліку, дзякуючы адсутнасьці статыстыкі. На працягу студзеня звольнена 71000 рабочых, і па думцы асьвядомленых колаў, лічба беспрацоўных 2 мільёны не зьяўляецца пераўвялічанай. З усіх бакоў паступаюць весткі аб звальненьні і скарачэньні рабочых, аб зачыненьні фабрык, аб увядзеньні няпоўнага тыдню і зьніжэньні зарплаты. Экспорт за студзень—красавік упаў на 15 мільёнаў іен і складае 518 мільёнаў. Імпорт упаў на 228 мільёнаў і складае за той-жа пэрыод 647 мільёнаў іен.

Выбары дэлегатаў на конгрэс Прафінтэрну

НЬЮ-ЁРК, 20. У Чыкаго, Дэтройце, Сіэтлі, Бастоне, Нью-Ёрку адбыліся масавыя сходы рэволюцыйных рабочых для выбараў дэлегатаў на конгрэс Профінтэрну.

ЛЁНДАН, 20. На масавым мітынгу бастуючыя рабочыя Брэдфорду пастанавілі адправіць двух дэлегатаў на будучы конгрэс Профінтэрну.

Беспрацоўе ў Чэха-Славакii

ПРАГА, 22. Па афіцыйнай статыстыцы, на першае красавіка ў Чэха-Славакіі лічылася 88005 беспрацоўных—рэкордны лік за апошнія пяць год. Патрэбна мець на ўвазе, што сапраўдны лік беспрацоўных прыблізна ўтрое перавышае афіцыйныя даныя.

Арышты бастуючых рабочых

ПАРЫЖ, 22. 20 дзён ужо бастуюць 1500 рабочых будаўнікоў Рэймса, патрабуючы павышэньня зарплаты. Поліцыя і жандармэрыя робяць шматлікія арышты. Усякія згуртаваньні рабочых, нават у самай нязначнай колькасьці, адразу-ж разганяюцца. Аднак, забастоўшчыкі трымаюцца ўпарта.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў закончылася перамогай рабочых

СТАМБУЛ, 22. Па паведамленьням з Індыі, забастоўка 5000 рабочых на адной з тэкстыльных фабрык Дэлі, якая пачалася 16-га красавіка, закончылася поўнай перамогай рабочых. Усе патрабаваньні бастуючых былі прыняты адміністрацыяй. Забастоўка мела ярка выяўленую політычную афарбоўку. На другі дзень пасьля пачатку забастоўкі рабочыя дэманстравалі на вуліцах гораду з чырвонымі сьцягамі.

Забастоўка рабочых трамваю

ПАРЫЖ, 22. У Оране (Алжыр) ужо тыдзень бастуюць рабочыя трамваю, патрабуючы павышэньня зарплаты. Сэкратар унітарнага профсаюзу трамвайшчыкаў—арыштаван. Склік сходу бастуючых забаронен.

Горад Цзінсучэн заняты комуністымі

НЕЙПІН. Комуністычныя атрады занялі горад Цзінсучэн на мяжы правінцыі Аньхуэй і Цзянсу. Атрады маюць артылерыю.

Апэляцыйны суд зацьвердзіў прыгавор над Андрэ Марці

ПАРЫЖ, 19. 17-га мая апэляцыйны суд у Парыжы канчаткова зацьвердзіў асуджэньне таварыша Андрэ Марці на 5 год турэмнага зьняволеньня. Зараз-жа пасьля рашэньня апэляцыйнага суду, т. Марці, які пратрымаўся на працягу 2-х год у турме Санта ў Парыжы, пераведзен у дом зьняволеньня ў Клэрво, дзе яго трымаюць у спэцыяльным рэжыме, далёка ад яго таварышоў і пазбаўляюць іх наведваньня. Рабочыя масы парыскага раёну організоўваюць кампанію ў абарону тав. Марці.

Пяць францускіх мінаносцаў пацярпелі аварыю

ПАРЫЖ, 21. У час моцнай буры пацярпелі аварыю пяць францускіх мінаносцаў, якія ўдзельнічалі ў марскіх манэўрах. Мінаносцы зьвярнуліся ў Тулон для рамонту

„Чырвоны агляд моладзі“

БЭРЛІН, 20. Наперакор забароне ўраду швэйцарскага кантонуАаргаў у Бадэне адбыўся організаваны комсамолам чырвоны агляд моладзі з удзелам 1500 рабочых. 50 рабочых арыштавана.

Комуністычныя атрады вядуць пасьпяховае наступленьне

ШАНХАЙ, 22-5. Комуністычныя атрады захапілі гарады Сімагоу і Хаячуа (абодва за 40 міль ад Ханькоу). У бойках за гэтыя гарады ўрадавае войска пацярпела цяжкае паражэньне.

У глыбіні провінцыі сялянскі рух ня суціхае. Імпэрыялістычны друк раіць кітайскім генэралам „спыніць між‘усобную вайну“ і ўзяцца за сур‘ёзнае зьнішчэньне камуністаў, уплыў і сіла якіх няспынна ўзрастае.

ШАНХАЙ. Атрады „чырвоных кашуль“ ня спыняюць выступаць у Чарсабадзкім, Мардаскім і Наўшэрскім раёнах. Горад Ванну пераноўнен войскам.

ТОКІЁ, 21. Як паведаляюць з Харбіну ўчора ў Чанчуне арыштавана 9 кітайцаў, якія абвінавачваюцца ў комуністычнай дзейнасьці і падрыхтоўцы к загаворам.

Паход КСМ за організацыю працы ў колгасах

Шырэй разгорнем соцыялістычныя формы працы ў колгасах

Ударніцтва і соцспаборніцтва ў колгасах імя Сталіна, „Чырвонай Зьмены“, „Беларускай Вёскі“ і „Краіны Саветаў“ забясьпе- чылі пасьпяховае выкананьне плянаў і скачэньня сяўбы раней тэрміну

Мобілізуем усе сілы на організацыю соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў працы колгасаў, зьнішчым пагро- зрыву сваечасовага скачэньня вясновай сяўбы па БССР

Колгас імя Сталіна скончыў сяўбу

на 11 дзён раней тэрміну і перавыканаў плян на 9 проц.

Колгас імя Сталіна (Самахвалаўскі раён) з посьпехам скончыў сяўбу на 11 дзён раней тэрміну. Плянавыя меркаваньні колгаснага савету перавыкананы колгасьнікамі на 9 проц.

20-га мая ўся моладзь колгасу імя Сталіна выяжджае на дапамогу экономічна-слабейшаму колгасу „Чырвоны Партызан“, працаваць будуць тры дні.

Колгас зараз пераключае сваю працу на ўборачную кампанію. Кузьня працуе поўным хадам. Ва ўдарным парадку рамантуюцца сельска-гаспадарчыя прылады. Адчынена сталярная майстэрня. Колгас рамантуе інвэнтар ваколічнаму бядняцка-серадняцкаму сялянству.

Праца ў колгасе разьбіта па разрадах, кожны колгасьнік мае сваю пэўную нагрузку' якую і выконвае.

Трэба адзначыць, што за час вясеньняй пасеўкампаніі ў колгасе ня было прагулаў. Сваімі ашчаднымі адносінамі да інвэнтара, да рабочага часу асабліва выдзяляецца моладзь.

З. Бакштэйн.



Вучні Парыцкай ШСМ на сяўбе бульбы ў колгасе в. Масеенкі.

Колгас імя Войкава справу організацыі працы павінен довесьці да канца

Колгас імя Войкава (Бабруйшчына) спачатку сяўбы вельмі марудна працаваў. Ня ўлічылі і не разьмеркавалі працоўнай сілы, не організавалі брыгад для выкананьня асобных галін працы (ворыва, баранаваньне і г. д.). Ня было і працоўнай дысцыпліны сярод колгасьнікаў. Усё гэта пагражала зрывам вясновай сяўбы. Савет колгасу і комсамольская ячэйка да апошняга часу ня прымалі ніякіх мер барацьбы з гэтай пагрозай.

І толькі зараз, калі комсамольская організацыя выступіла ў паход за організацыю працы, комсамольская ячэйка колгасу імя Войкава ўзялася за работу. Зараз усе колгасьнікі разьмеркаваны па брыгадах, выпрацаван вытворчы плян працы, з гэтага часу працоўная дысцыпліна і вытворчасьць працы ў колгасе значна ўзьнялася.

Колгас ужо скончыў сяўбу раньніх збожжавых культур, а ў бліжэйшы час будзе скончана сяўба і астатніх, больш позьніх, культур. Але побач з гэтымі посьпехамі ў працы колгасу ёсьць яшчэ шмат хібаў: колгас не перашоў да зьдзельнай працы, не ўстанавіў яшчэ аплаты за працу, нерацыянальна скарыстоўвае працу асобных колгасьнікаў.

Напрыклад, колгас мае шаўца, але замест скарыстаньня па спэцыяльнасьці яго пасылаюць на ворыва, дзе па фізычнаму стану здароўя ён працаваць ня можа. У гэты час колгас наймае шаўца і плаціць у тры разы даражэй.

Колгас павінен гэта ўлічыць і больш правільна падыйсьці да вырашэньня пытаньня організацыі працы і рацыянальнага скарыстаньня сваёй працоўнай сілы.

А.

Калі-ж сапраўды павернецеся тварам да вытворчасьці?

Паход за організацыю працы ў колгасах яшчэ да гэтага часу не закрануў Барысаўскую комсамольскую організацыю.

„Чырвоная Зьмена“ ўжо пісала аб прарывах у працы асобных зьвеньняў Барысаўскай організацыі, але зараз павінна констатаваць, што гэтыя прарывы ня выпраўлены. Шэраг комсамольскіх ячэек яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

Практычная організацыя працы ў колгасах амаль ніводнай вясковай ячэйкай не распачата, тады як на шэрагу колгасаў з боку асобных комсамольцаў назіраюцца кепскія адносіны да працы, нявыхады на працу, недысцыплінаванасьць.

Нічога ня робяць і гарадзкія ячэйкі, якія шэфствуюць над вясковымі. Пасылаемыя ў ячэйкі дэлегаты выяжджаюць на дзьве гадзіны і не правёўшы ніякай працы зварочваюцца.

Усе гэтыя факты кажуць аб тым, што Барысаўская організацыя ня здолела зрабіць належнага пералому ў працы па практычнаму ўдзелу ў колгасным будаўніцтве.

С. У. Д.

Адказ колгасу „Арэшкавічы“

Пухавіцкага раёну

Дарагія таварышы колгасьнікі!

14-V—30 г. мы атрымалі Вашу тэлеграму аб скачэньні Вамі сяўбы.

Выканбюро кустаб'яднаньня рабочага таварыства садзейнічаньня колектывізацыі сельскай гаспадаркі пры ЦПС швэйнікаў і рабочыя фабрыкі „Акцябр“ у колькасьці 2000 чал. — шлем Вам шчырае прывітаньне за Вашу дружную колектыўную працу па выкананьні пасеўнай програмы раней вызначанага тэрміну.

Мы, рабочыя з вялізарнейшай радасьцю прыймаем Ваша паведамленьне і адначасова даводзім да Вашага ведама, што рабочыя швэйнай фабрыкі «Акцябр“ таксама выканалі прамфінплян за першае паўгодзьдзе на 103,27 проц., а за красавік м-ц на 113 проц.

Ваша выкананьне програмы сяўбы раней вызначанага тэрміну яскрава сьведчыць аб тым, што генэральная лінія нашай партыі па колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі зьяўляецца правільнай.

Дарагія таварышы! Скончыўшы сяўбу, Вы павінны зрабіць належныя вынікі Вашай колектыўнай працы, што толькі колектыўнай працай шляхам зьнішчэньня старых межаў, абагуленьня сельскай гаспадаркі мы можам палепшыць сваё жыцьцё і дабрабыт.

Цяпер Ваша галоўная задача—апрацаваць і засеяць пустуючыя вучасткі зямлі ў вашым сельсавеце, а таксама організаваць патрэбную дапамогу бліжэйшым колгасам, якія адстаюць у сяўбе і адначасова дапамагчы індывідуальным бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам, якія ня маюць магчымасьці ўласнымі сіламі апрацаваць і засеяць свае палі.

Датэрміновае выкананьне [illegible] програмы і перавыкананьне [illegible] прамфінпляну зьяўляецца [illegible]шым падарункам XIII зьезду [illegible]ністычнай партыі Беларусі і XVI зьезду УсеКП(б), як поўная гарантыйная сувязь рабочай клясы з працоўным сялянствам на фронце пабудовы соцыялізму і выкананьня 5 гадовага пляну ў 4 гады.

Няхай жыве сувязь гарадзкой вытворчасьці з колгаснай вытворчасьцю сельскай гаспадаркі.

З комуністычным прывітаньнем:

Сэкратар партколектыву швэйнай ф-кі «Акцябрь“ **Блоштэйн.**

Старшыня фабкому **Левін.**

Старшыня куста па садзейнічаньню колектывізацыі с.-г. **Росьлік**

Колгасы: „Чырвоны Сьцяг“, „Чырвоная Зьмена“, „Беларуская Вёска“ і „Краіна Саветаў“—скончылі сяўбу

Колгас „Чырвоны Сьцяг“ Сьмілавіцкага раёну скончыў вясеньнюю сяўбу і пераключыў працу на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Комсамольская організацыя ў пасеўнай кампаніі прымала актыўны ўдзел. Пляны сяўбы і пашырэньня плошчы выкананы.

ФРЫД.

Колгасы імя „Чырвонай Зьмены“ і „Беларускай Вёскі“ (Тураўскі сельсавет, Меншчына) скончылі сяўбу яравога кліну. Пляны вясеньняй сяўбы колгасы выканалі.

ЮНКОР.

Колгас „Краіна Саветаў“ Сьмілавіцкага раёну скончыў вясеньнюю сяўбу. Пляны засеву яравога кліну колгас выканаў на 100 проц.

ШЫПІЛЬКЕВІЧ МІХАСЬ.

Райпрацаўнік Стальмаховіч

замест дапамогі, зрывае працу

Да апошняга часу пытаньнем організацыі працы ў колгасах Плешчаніцкага раёну ніхто не займаўся. Працоўная дысцыпліна па шэрагу колгасаў сярод колгасьнікаў адсутнічала, вытворчасьць працы была нездавальняючай і колгасьнікі ня выконвалі сваіх норм заданьняў. Праца вытворчых нарад і соцыялістычнае спаборніцтва ні ў водным колгасе ня было з-організавана.

Зараз усе комсамольскія ячэйкі колгасу організавалі ўдарныя брыгады для выкананьня асобных прац, ахапіўшы імі на 100 проц. комсамольцаў, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу і дарослых колгасьнікаў. Брыгады ўступілі паміж сабою ў соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае скачэньне працы.

Але побач з гэтым трэба констатаваць, што ўсё яшчэ комсамольская організацыя не змагла ў выстарчальнай меры мобілізаваць грамадзкасьць на практычную дапамогу ў правядзеньні паходу за організацыю працы.

Напрыклад, у Кайкаўскім сельсавеце комсамольская ячэйка, організаваўшы з комсамольскай моладзі брыгады, стала распаўсюджваць гэты мэтад працы на астатніх колгасьнікаў, а асобныя партыйцы выступалі і казалі аб нямэтазгоднасьці і організацыі ўдарных брыгад. У Каменскім сельсавеце на агульным сходзе колгасьнікаў, калі яны аб явілі сябе ўдарнікамі і прыступілі да складаньня сьпісаў ударных брыгад райпрацаўнік—тав. Стальмаховіч—прапанаваў спыніць сьпіс, мотывуючы прапанову тым, што калі ўсе будуць ударнымі, дык нечага будзе рабіць.

Плешчаніцкай комсамольскай організацыі патрэбна зараз мобілізаваць грамадзкасьць на практычны ўдзел і дапамогу ў організацыі працы ў колгасах, а партыйным ячэйкам забясьпечыць належным партыйным кіраўніцтвам і практычнай дапамогай працу комсамольскіх ячэек.

ЧАЧОТКА.



Комсамольская брыгада ў ко[...] па ўборцы саду.

Організацыяй энтузіязм[...] мас колгасьнікаў

зьнішчылі пагрозу не[...] кананьня плянаў сяў[...]

Да абвяшчэньня ком[...] лам паходу за організа[...] працы ў колгасе, комса[...] ская ячэйка колгасу «Са[...] кая Беларусь» Сьмілавіц[...] раёну амаль ніякага ўдз[...] ня прымала ў працы кол[...] У колгасе ня было пара[...] Колгасьнікі ня ведалі, я[...] працу ім трэба выконва[...] як яна будзе аплачвацца[...] зіраўся часты нявыхад [...] працу і невыкананьне зад[...] няў. Усё гэта складала [...] грозу невыкананьня калг[...] плянавых заданьняў вясен[...] сяўбы.

Але з часу разгортва[...] комсамольскага паходу за [...] ганізацыю працы, ячэйка [...] ла на сябе задачу орган[...] цыі сярод колгасьнікаў бр[...] і наладжваньня працы. За[...] усе колгасьнікі разьмерка[...] па брыгадах для выканан[...] асобных работ (баранаван[...] ворыва, догляд за жывё[...] г. д.), колгасьнікамі абга[...] ны нормы выпрацоўкі і а[...] та працы.

Асобныя брыгады ўжо ў[...] пілі паміж сабою ў соцыя[...] тычнае спаборніцтва, за[...] чаюць умовы на леп[...] ўзьняцьце вытворчасьці пр[...] зьніжэньне прагулаў і н[...] хадаў на працу і хутчэ[...] выкананьне плянаў вясен[...] сяўбы.

Брыгады з ахвотаю вык[...] ваюць узятыя на сябе [...] вязкі па соцыялістычнаму [...] борніцтву і пагроза, я[...] складалася ў пачатку пр[...] колгасу, зьнішчана разго[...] ваньнем соцыялістычных ф[...] працы.

Чуб[...]

Рыхтуем кадры і дапамагаем кал[...] гасьнікам

Парыцкая школа колгаснай моладзі (Бабруйшчына) організа[...] вытворчую дапамогу колгасам па правядзеньню вясеньняй ся[...] Вучні школы організавалі брыгады па асобных галінах сельска-гас[...] дарчай працы і сыстэматычна наладжваюць выхады ў аколі[...] калгасы.

Брыгада садаводаў у колгасе в. Масейнікі ачысьціла і прыва[...] культурны від тры сады, перасадзіла 100 фруктовых дрэў і органі[...] вала гадавальнік садовых дрэў.

Паляводчая брыгада апрацавала і дапамагла засеяць 18 гэкта[...] яравых культур у гэтым колгасе.

Комсамольская ячэйка і школа ўзялі шэфства ашчэ над трыма ко[...] гасамі, якім дапамагаюць у правядзеньні вясеньняй сяўбы.

Мяркуецца скончыўшых школу вучняў накіраваць садаводам[...] жывёлагадоўцамі на сталую працу ў гэтыя колгасы.

Клімянкоў



„Кавалерыйскія“ атрады павольна перабудоўваюць сваю работу на баявую ногу

Комсамольскае кіраўніцтва павінна мобілізаваць „кавалерыйскую“ ініцыятыву на ажыцьцяўленьне важнейшых задач соцыялістычнага будаўніцтва

Сыстэматычна кіраваць „лёгкай кавалерыяй“— першы абавязак комсамолу

Шэрагі „кавалерыстых“ узрасьлі да памераў, якія ставяць „ЛК“ у першыя шэрагі ініцыятыўнага пролетарскага руху“. Цяпер, пасьля такой аграмаднай работы, праробленай групамі „ЛК“, ніхто ня зможа адмаўляць карысьць і неабходнасьць існаваньня гэтай комсамольскай „коньніцы“, масавага пролетарскага кантролю.

Але, на жаль, некаторыя камітэты комсамолу (ня будзем ужо гаварыць аб профсаюзах), недацэньваючы работы „ЛК“, дрэнна кіруюць групамі.

Некаторыя камітэты закінулі работу груп «ЛК». У выніку — атрады „лёгкай кавалерыі“ замест таго, каб праводзіць рашэньні зьлёту ў жыцьцё, нярэдка складалі зброю змаганьня і спакойна адпачывалі.

Пасьля гэтага ня дзіва, калі мы атрымліваем ад „кавалерыстых“-юнкораў матар'ял аб тым, што рашэньні зьлёту ня толькі не праводзяцца ў некаторых месцох у жыцьцё, але не даводзяцца да кожнага рабочага, працоўнага селяніна, да „кавалерыстага“.

Некаторыя комсамольскія організацыі яшчэ не разумеюць усяе важнасьці і глыбокага політычнага сэнсу работы „лёгкай кавалерыі“. Яшчэ больш — некаторыя РК (Заслаўскі) не разумеюць таго, што работу „ЛК“ можна і неабходна паднарадкаваць прамфінпляну, колектывізацыі.

Замест таго каб узброіць „ЛК“ на барацьбу з недахопамі, з усімі ненармальнасьцямі колектывізацыі, калі бывае „кавалерыстыя“ ў камітэтаў просяць працу, ім адказваюць: „ня суньцеся з сваёй „кавалерыяй“, мы заняты колектывізацыяй; альбо: „Кіньце, хлопцы, з „кавалерыяй“! — Хіба вы ня бачыце, што ў нас больш важныя справы ёсьць?“

На жаль, такія дзяляцкія размовы можна сустрэць ня рэдка.

Ад „лёгкай кавалерыі“ зараз патрабуецца мобілізацыя сіл на барацьбу з бюрократызмам, які падрывае работу, з усімі, хто перашкаджае выканаць і перавыканаць прамфінплян, супроць провакацый і шкодніцтва кулацтва, накіраваных на зрыў колектывізацыі. Правяраць і дапамагаць сельсаветам ажыцьцяўляць апошняе рашэньне ЦВК СССР аб ролі сельсаветаў у сувязі з колектывізацыяй і задачай ліквідацыі кулацтва як клясы. Быць організатарамі ў пастаноўцы працы ўнутры колгасу. Правяраць становішча сілосных ям, праверыць, як працуюць клюбы, хаты-чытальні, як прасоўваецца пралетарская культура ў гушчы працоўных, як ідзе праца па ліквідацыі няпісьменнасьці, забясьпячаньне леманатарамі і інш.

На адбыўшайся днямі ўсебеларускай нарадзе па чыстцы сав. апарату ўсе прамоўцы падкрэсьлівалі дрэнны ўдзел у гэтай політычна-важнай справе комсамолу і „лёгкай кавалерыі“. У наш апарат уцёрлася ня мала чужых нам людзей, якія стараюцца шкодзіць нашаму будаўніцтву, якіх неабходна выгнаць з нашага апарату, а „кавалерыя“ надзвычай мала робіць у гэтай галіне.

„Кавалерыстым“ неабходна змагацца з недахопамі ў комсамольскіх камітэтах, крытыкаваць сыстэму іх работы, біць па тых, хто не аддае ўвагі атрадам „Л. К.“ Патрабаваць хуткага рэагаваньня на выяўленыя «кавалерыстымі“ недахопы.

Забясьпечыць добрую працу «лёгкай кавалерыі» —першы абавязак комсамолу, а таму мы патрабуем ад комсамольскіх камітэтаў больш увагі і кіраўніцтва групамі «лёгкай кавалерыі».

Атрады „ЛК“, зьяўляючыся ўдарнай групай комсамолу на фронце барацьбы з бюрократызмам, павінны згрупаваць усе свае сілы на праверку практычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду на ўмелае спраўленьне ў час недахопаў нашага соцбудаўніцтва, організуючы ініцыятыву мас моладзі на выкананьне рашаючых задач нашай партыі.

(З рэзолюцыі ўсебеларускага зьлёту)

Што выявіла чыстка Бабруйскага Цэрабкопу

Нядаўна пачалася праверка працы і чыстка апарату **Бабруйскага Цэрабкопу**. Выяўлена шмат прарываў і недахопаў. Ня гледзячы на шэраг дырэктыў з боку вышэйшых органаў, праца па ўцягненьню беднаты і батрацтва ў коопэрацыю не разгорнута. На сёньнешні дзень яшчэ не коопэравана каля **3 тысяч беднякоў**, не скарыстана фонду **9 тычяч рублеў**. Культмасавай працы сярод беднаты і батрацтва не вядзецца.

Расцэнкі на тавары затрымліваюцца ў бухгальтэрыі па месяцу (Ясельскае, Шчадрынскае і інш таварыствы). Акрспажыўсаюз адпраўляў у Ленінград крухмал, так яго ня прынялі і цяпер ён ляжыць на складзе зглумлены—шкоды на 1500 руб.

Антывялікодная кампанія сарвана з-за галавацяпства **Акрсаюзу**, бо літаратуру разаслалі па месцох толькі **19 красавіка**. Фактуры рассылаюцца праз 3 тыдні.

Гандлёвы апарат засьмечан яшчэ чужым элемэнтам растратчыкамі, бюракратамі. Самакрытыка не разгорнута.

Ш. М.

На „кавалерыйскае“ пяро

У колгасе „Зьвязда“ (Меншчына) працуе старшынёй колгасу былы ўласьнік піўной і чайнай, пазбаўлены права голасу—Ёсель Глікман

Яму ня месца ня толькі на пасадзе старшыні колгасу, але наогул у колгасе.

„Л. К.“

* *
*

У вёсцы Казённая Рудня Прылепскага сельсавету Астрашыцка-Гарадзецкага раёну (Меншчына) усе добра ведалі Астрахана Ару, які меў буйны гандаль мануфактурай і розным жалезам. На „зробленыя“ грошы пабудаваў сабе млын, які потым згарэў. Калі краму Ары конфіскавалі, ён паехаў у другі раён і нейкім чынам папаў з усёй сям'ёю ў колгас „Бальшавік“. Пасьля гэтага (ужо адзін) папаў у папраўчы дом.

Сыны яго вучацца ў савецкіх навучальных установах.

Астрахан Лейба вучыцца ў менскай профшколе мэталістых. Астрахан Лейзар вучыцца ў Горках у сельска-гаспадарчай акадэміі.

Патрэбна ачысьціць шэрагі нашых навучальных установ ад такіх людзей, як Астраханы.

Х. У.

* *

У Магілеўскім Політасьвет тэхнікуме вучыцца „комсамолец“ Фалькоўскі Фэлікс, які паступіў у тэхнікум як батрак. На самой-жа справе Фэлікс Фалькоўскі—сын абшарніка. Бацька Фэлікса да 1919 году арэндаваў маёнтак на плошчы 200 га у Плешчаніцкім раёне (Меншчына). У 1926 годзе ён судзіўся за крадзеж кароў у сялян. Зараз мае малатарню, якую аддае беднаце за плату.

Комсамольскі колектыў аб усім гэтым даведаўся, выключыў Фэлікса Фалькоўскага з комсамолу і хадатайнічае аб звальненьні яго з тэхнікуму. Тады Фалькоўскі прывёз ад сэкратара Акалоўскай ячэйкі КП(б)Б даведку аб тым, што ён не з сям'і абшарнікаў. Раней гэты-ж сэкратар прыслаў даведку аб тым, што Фалькоўскі Ф. сапраўды з сям'і абшарнікаў.

Плешчанскаму РК КП(б)Б трэба праверыць гэту справу.

Сав—ей.

„ГАСПАДАРНІК“

Загадчык гаспадаркі Менскай профшколы будаўнікоў Гранда бяз ведама і згоды стыпэндыяльнай камісіі на працягу двух месяцаў выдаваў стыпэндыю вучню Розэнблюму, які нават ня быў залічаны кандыдатам на яе. Адміністрацыя школы і належныя органы не зьвярнулі на гэта ўвагі.

Вучні малярнага цэху яшчэ з кастрычніка м-ца мінулага году за рамонт клюбу не атрымалі свайго заработку, ня гледзячы на тое, што праўленьне клюбу пасьля сканчэньня рамонту выплаціла належную суму грошай. Аб гэтым шмат разоў пісалі ў насьценгазэце, але Гранда і дагэтуль корміць „заўтракамі“.

Шмат пісалі ў насьценгазэце аб тым, што на двары школы бяз усякай карысьці валяецца і гніе шмат будаўнічага матар'ялу (дошкі, бярвеньне і інш.), але мер ніякіх ня прынята.

У гэтым годзе профшкольцы выехалі на чатырохмесячную практыку. Ужо працуюць каля трох тыдняў. 25 проц з зарабляваных профшкольскіх грошай штомесяц (акрамя апошняга) будуць ісьці на палянашэньне профшкольскага быту: на пральню, сталоўку і інш., але Гранда ўхітрыўся з гэтых 25 проц вырваць у сваю кішэню 25 рублёў кожны м-ц пад рубрыкай „дабавачных да пэнсыі“. І гэта ў той час, калі загадчыку гаспадаркі абсалютна няма чаго рабіць... Гэты факт нельга інакш назваць, як рвацтва.

Рыгаровіч.


Мэханізм

на якім далёка не заедзеш

Ці павінна так быць?

Група „лёгкай кавалерыі“ ў Нова-Беліцкай коопэрацыйнай ячэйцы (Гомельшчына) фактычна ня існуе.

Новаабраны кіраўнік групы тав. Ліпкін не жадае працаваць і не працуе.

Нядаўна тры «кавалерыстыя», даведаўшыся аб тым, што ў арцелі цырульнікаў ёсьць шмат недарэчнасьцяй (заціск самакрытыкі, грубыя адносіны да кліентаў), зрабілі па сваёй ініцыятыве налёт. Але вынікі налёту ляжаць у налётчыкаў у кішэні.

Аркадзь Сушанскі.

„ЛК“ недастаткова ўсьвядоміла сваю ролю і месца ў пытаньні ўнутрыкомсамольскага жыцьця і працы? Адсюль—слабая ўвага „ЛК“ пытаньням барацьбы з хваробнымі зьявішчамі і скажэньнямі лініі партыі і опортунізмам на практыцы. Такое становішча пры нездавальняючым кіраўніцтве работай „ЛК“ з боку камітэтаў і ячэяк комсамолу небясьпечна момантамі адрыву „ЛК“ ад комсамольскага кіраўніцтва, што зьяўляецца палітычна шкодным і зусім нездавальняючым зьявішчам.

(З рэзолюцыі ўсебеларускага зьлёту „ЛК„).

Праз удзел у шэфстве заводаў над дзяржапаратам

Комсамол павінен падрыхтаваць кадры рабочай моладзі для вылучэньня ў апарат

Апублікаваная ў „Чырвонай Зьмене“ ад 13 мая пастанова бюро ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў чыстцы савецкага апарату і масавым рабочым кантролі павінна прыкаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі Беларусі. Раз назаўсёды трэба пакончыць з пасыўнымі адносінамі шэрагу комсамольскіх організацый да гэтай важнай політычнай справы.

Усебеларуская нарада, якая нядаўна адбылася пры **ЦКК РСІ** па пытаньню чысткі апарату і шэфства заводаў над сав. установамі, падкрэсьліла, што з боку комсамолу праяўлена недастатковая ўвага і слабая дапамога органам КК РСІ ў праводзеньні гэтай адказнай політычнай задачы. Агульны лік комсамольцаў, якія прымаюць удзел у брыгадах па чыстцы цэнтральнага апарату, зусім нязначны. Вытворчыя ячэйкі КСМ мала клапаціліся аб тым, каб забясьпечыць склад вылучаных ад прадпрыёмстваў рабочых брыгад па чыстцы савапарату належнай колькасьцю комсамольцаў і рабочай моладзі. Такое зьявішча можна тлумачыць толькі тым, што шэраг ячэек КСМ да гэтага часу недаацаніў політычнага значэньня чысткі савапарату і вялікай ролі, якую павінна адыграць новая форма масавага кантролю зьнізу—шэфства заводаў над савапаратам.

Ідэя шэфства, узьнікшая па ініцыятыве рабочых на грунтце політычнага ўзросту сьвядомасьці і актыўнасьці пролетарскіх мас, павінна быць падтрымана комсамолам. У гэтай справе комсамольскія організацыі павінны займаць не апошняе месца.

За апошнія гады мы дасягнулі асабліва значных посьпехаў у працы КСМ у справе барацьбы з бюракратызмам.

Праз шэфства мы, побач з ажыцьцяўленьнем штодзённага пролетарскага кантролю зьнізу над савецкім апаратам і праверкай выкананьня ім важнейшых дырэктыў партыі і ўраду будзем навучаць і падрыхтоўваць новыя пролетарскія кадры і вылучаць іх на адказную працу ў Дзяржапарат.

Комсамольскія організацыі павінны неадкладна прыступіць да прапрацоўкі дырэктыў ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб шэфстве заводаў і настановы бюро ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў чыстцы савапарату і ў масавым рабочым кантролі, давесьці гэтыя рашэньні да самых нізоў. Пры актыўным удзеле комсамолу, партыйных і професыянальных організацый органы КК РСІ здолеюць паставіць гэту важнейшую політычную задачу на больш высокую ступень.

Міх. Чарны.

БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З ПРАВЫМ ОПОРТУНІЗМАМ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ; РАШУЧА БІЦЬ ПА „ЛЕВЫХ“ ФРАЗЁРАХ

Рэзолюцыя

бюро гомельскага акругкому і гаррайкому ЛКСМБ ад 13-V-30 г. аб выніках праведзенага політ-бою паміж комсамольскімі колектывамі швэйнай фабрыкі „Комінтэрн“ і №-м кав. палком

1. Заслухаўшы і абгаварыўшы вынікі праведзенага політ-бою, бюро АК і гарком ЛКСМБ канстатуе: пасьпяховы рост соцыялістычнага сэктару, як у горадзе, так і на вёсцы, размах колгаснага руху за апошнія гады і ўдарніцтва сярод рабочае клясы і мас колгасьнікаў, політыка партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, выклікаюць узмоцненае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў, што мае свой адбітак на ўсіх вучастках нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтае супраціўленьне прымае розныя формы, пачынаючы ад забойства лепшых грамадзкіх працаўнікоў на вёсцы, пераходзячы і на ідэолёгічны фронт. Гэтая барацьба мае таксама адбітак на менш устойлівыя зьвеньні партыі і комсамолу, якія атрымліваюць сваё выражэньне ў правым ухіле, што зьяўляецца галоўнай небясьпекай у сучасны момант, а таксама і „левых“ загібах, што дапамагаюць праваму ўхілу ў яго паклёпах на партыю і імкненьні сьцягнуць партыю ў опортуністычнае балота. Гэта мае таксама адбітак на паасобных зьвеньнях партыі і комсамолу пры вырашэньні нацыянальнага пытаньня ва ўмовах Беларусі, беларускім нацыянал-дэмократызьме, як больш небясьпечным у даны момант і шовінізмах усіх колераў.

Усё гэта асабліва ставіць задачу перад комсамолам, як верным памоцнікам партыі, узброіцца марксысцка-ленінскай тэорыяй, каб пасьпяхова весьці барацьбу з усялякімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі, за мобілізацыю мас на выкананьне баявых задач соцыялістычнага будаўніцтва.

2. Праведзены політ-бой паміж двумя буйнейшымі колектывамі гаррайёну даў штуршок да вывучэньня марксысцка-ленінскай тэорыі. Аднак, політ-бой сьведчыць аб недастатковай тэорытычнай падрыхтоўцы організацыі. Частка організацыі мала знаёма з галоўнымі пытаньнямі політыкі партыі, асабліва ў нацпытаньнях, што зьяўляецца зусім нецярпімым у шэрагах Ленінскага комсамолу.

3. Політ-бой, паставіўшы сваёй асноўнай мэтай праверыць, наколькі комсамольская організацыя зьяўляецца памоцнікам партыі ў барацьбе за яе генэральную лінію, паказаў, што ня гледзячы на цэлы шэраг пэўных паказальнікаў (індывідуальная і колектыўная падрыхтоўка, узмацненьне інтарэсаў да політ-вучобы ў выніку шэрагу правільных партыйна-вытрыманых адказаў), мелі месца адказы, апашляючыя лінію партыі, цягнуўшыя ў опортуністычнае балота. Яны ня сустрэлі належнага адпору і тлумачэньня з боку кіраўніцтва політ-бою, што пацьвярджаецца наступнымі фактамі ходу політ-бою:

а) Партыя ў сваім гістарычным разьвіцьці, змагаючыся за чыстату марксысцка-ленінскай тэорыі і з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі на розных этапах, вядучы барацьбу на два фронты, высоўвала галоўную небясьпеку, на якую мобілізоўвала ўвагу і концэнтравала сваю барацьбу, чым загартоўвала і ўзмацняла свае шэрагі ў перамозе над рознымі плынямі і імкненьнямі адцягнуць партыю ад генэральнай лініі.

У пэрыод разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва, як у горадзе, так і на вёсцы, правы ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай, на якую неабходна накіраваць свой агонь, не паслабляючы барацьбы з „левымі“ загібшчыкамі, што зрываюць справу колектывізацыі, зьяўляючыся фактычна агентурай правых ухілістых, а таксама прымірэнцкімі адносінамі да іх. Паміж тым, пры пастаноўцы пытаньня ў час ходу політ-бою: „што небясьпечней—правы, або „левы“ загіб у колгасным руху і чаму?“, быў адказ: „небясьпечны абодва, бо мы вядзем барацьбу з „левым“ загібам, мы вядзем барацьбу з правым (сьценограмы—стар. 14), „міжнароднік“ дае заключэньне, што адказ правільны. Гэты адказ скажае пастаноўку пытаньня аб барацьбе на два фронты, не выдзяляючы галоўную небясьпеку.

Пры пастаноўцы пытаньня: „У чым корань памылак па сялянскаму пытаньню ў колгасным будаўніцтве?“, быў адказ: „корань памылак заключаецца ў тым, што не ва ўсіх мясцох, але ў большасьці, колгасы організоўваліся не добраахвотна, а адміністрацыйным парадкам“—на гэты адказ міжнароднік дае заключэньне:—„Адказ правідловы“ (сьценограмы стар. 10).

Гэты няясны адказ па-сутнасьці хіліць да правых опортуністых, якія гавораць, што рост колгасу ў асноўным ідзе дзякуючы адміністраваньню, а ня дзякуючы правядзеньню правільнай лініі партыі ў адносінах да батрацка-бядняцкай і серадняцкай часткі сялянства, гэты адказ не атрымаў належнага тлумачэньня з боку „міжнародніка“, які не падкрэсьліў адносін да серадняка, а абмежаваўся ацэнкай—„здавальняюча“. Цэлы шэраг іншых няправільных адказаў па пытаньнях пяцігодкі і нацыянальна-культурнага будаўніцтва яшчэ больш даводзіць, што кіраўніцтва політ-боем не ўзьняло на прынцыпова-політычную вышыню ход політбою, а абмежавалася прымяненьнем вузка-ўстаноўленых правіл політ-бою.

4. Прызнаючы дапушчаныя грубыя політычныя памылкі з боку міжнародніка тав. Слуцкера, які дэзорыентаваў масу комсамольцаў у шэрагу пытаньняў політыкі партыі давесьці да ведама райкому КП(б) і АК КП(б)Б, прасіць аб прыцягненьні яго да партыйнай адказнасьці.

5. Штаб, у складзе т. т. Левіна, Палея, Абрамовіча і апорга Н-га палка тав. Аўсянікера дапусьціў цэлы шэраг грубых політычных памылак, у прыватнасьці:

а) таварыш Левін, загадчык аддзелу адукацыі і быту Акругкомолу, будучы сябрам штабу, не рэагаваў і прымірэнча аднёсься да шэрагу права - опортуністычных тлумачэньняў (не рэагаваў на няправільнае тлумачэньне лініі партыі пасрэднікам і сам не даваў належнага тлумачэньня). А пры падвядзеньні вынікаў політ-бою дапусьціў грубую політычную памылку, не завастрыўшы ўвагі на выкрыцьцё меўшых месца скажэньняў партыйнай лініі ў ходзе політ-бою. ПРЫНЯЎШЫ ДА ВЕДАМА РАШУЧАЕ ПРЫЗНАНЬНЕ ДАПУШЧАНЫХ ПАМЫЛАК ТАВ. ЛЕВІНЫМ, АБВЯСЬЦІЦЬ ЯМУ ВЫМОВУ;

б) НАЧАЛЬНІКУ ШТАБУ ТАВ. ПАЛЕЮ—ПАСТАВІЦЬ НА ВІД.

в) ДАВЕСЬЦІ ДА ВЕДАМА БЮРО АК І ГАРРАЙКОМУ КП(б)Б АБ СЯБРУ ШТАБУ ТАВ. АБРАМОВІЧУ—КУЛЬТУРНЫМ ПРАЦАЎНІКУ ГОРРАЙКОМУ—АБ ДАПУШЧАНЫХ ІМ ПАМЫЛКАХ У КІРАЎНІЦТВЕ ПОЛІТ-БОЕМ;

г) Таксама давесьці да ведама Падзіва Н-га кав. палка аб тав. Аўсянікаве;

д) Акрамя паказаных таварышоў, прысутнічалі таварышы Ашаровіч і Невміц: яны таксама не рэагавалі, аб чым давесьці да ведама бюро АК КП(б)Б.

6. Вурокі праведзенага політ-бою па гарадзкой раённай організацыі павінны быць улічаны ўсёй комсамольскай організацыяй Гомельшчыны дзеля падвышэньня свайго ідэйна-політычнага ўзроўню, на падставе падвышэньня тэорэтычных ведаў дзеля ўцягненьня шырокіх мас рабоча-батрацкай і бядняйкай і серадняцкай моладзі ў соцыялістычнае будаўніцтва, дзеля мобілізацыі ўвагі ўсёй організацыі на барацьбу з рознымі адхіленьнямі ад ленінскай лініі партыі, вядучы бязьлітасную барацьбу з яе конкрэтнымі носьбітамі, як у тэорыі, так і на практыцы, адначасова не паслабляючы барацьбы за выкананьне прамфінпляну, колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, увязаўшы гэта з падвышэньнем політычнага ўзроўню комсамольскай організацыі, скарыстоўваючы для гэтага ўсе віды вучобы, уважліва падрыхтоўваючыся да прадстаячых політ-баёў, узьнімаючы на прынцыпова-політычную вышыню ход падрыхтоўкі і самога політбою.

7. У ажыцьцяўленьні гэтых задач правесьці наступнае:

а) склікаць раённыя актывы, на якіх паставіць даклад: „Вурокі політбою і задачы організацыі па падвышэньню ідэйна-політычнага ўзроўню“.

б) гэтае-ж пытаньне на працягу бліжэйшых двух тыдняў прапрацоўваць на ўсіх сходах ячэек.

8. Пасьпяховае вырашэньне намечаных задач па падвышэньню ідэйна-політычнага ўзроўню комсамольскай організацыі і мобілізацыі мас моладзі да яшчэ большага актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве патрабуе ўзмацненьня партыйнага будаўніцтва, на што бюро АК і Гар. ком. ЛКСМБ зварочвае ўвагу ўсёй акруговай партыйнай організацыі і адначасова заклікае ўсіх комсамольцаў і рабоча-батрацка-бядняцкую і серадняцкую моладзь згуртавацца навакол сталёвых шэрагаў бальшавіцкай партыі і пад сьцягам ленінізму, узброіўшыся марксыцкаленінскай тэорыяй, неадхільна ісьці ўперад да новых перамог у соцыялістычным будаўніцтве.

9. Бюро АК і гарком ЛКСМБ прызнае ненармальным, што з спазьненьнем падводзяцца вынікі праведзенага політ-бою і рэагуе на скажэньні лініі партыі, якія былі выказаны ў часе ходу політбою.

Прыклад, як ня трэба працаваць

Колектыў КСМ ф-кі „Чырвоная Зорка“ (Чашнікі) зьяўляецца прыкладам таго, як комсамольская організацыя часта ня здольна мобілізаваць увагу ўсёй рабочай моладзі фабрыкі на справу выкананьня прамфінпляну, на справу вырашэньня пастаўленых задач. Ня гледзячы на тое, што фабрыка аб'яўлена ўдарнай, маецца многа комсамольцаў і рабочай моладзі ня ўцягнутых ва ўдарныя брыгады.

Колектыў не мобілізаваў увагі комсамольцаў і рабочай моладзі на справу выкананьня прамфінпляну, на справу барацьбы з ілжэ-ўдарніцтвам, якое назіраецца на ф-цы ў пашыраным выглядзе, і як вынік,—мы маем выкананьне прамфінпляну за І-ы і ІІ-гі кварталы толькі на 94 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што колектыў зусім не кіраваў працай ударных брыгад і не жадаў займацца пытаньнем становішча вытворчасьці.

Трэба адзначыць, што да апошняга часу ня было парткіраўніцтва ў комсамоле. Парт. прымацаваныя не каведвалі сходаў, цэхавых ячэек комсамолу і на бюро колектыву КП(б)Б за ўвесь час ня было ніводнай справаздачы сэкратара колектыву КСМ аб становішчы працы колектыву.

Бюро РК КСМ заслухала справаздачу сэкратара колектыву аб ходзе выкананьня прамфінпляну і ўказала на меўшыйся прарыў. Яно мобілізавала ўвагу ўсёй раённай комсамольскай організацыі на выпраўленьне ўсіх дапушчаных памылак і перасьцерагала організацыю ад паўтарэньня такіх прарываў.

Сэкратар колектыву—т. Сімухоў—з працы зьнят. Яму вынесена вымова таксама як і ўсяму складу бюро колектыву за нядольнасьць сваечасова рэагаваць на прарыў, за несваечасовую мобілізацыю ўвагі комсамольцаў і рабочай моладзі на выкананьне прамфінпляну.

Зараз неабходна ўсяму колектыву выправіць дапушчаныя памылкі і мобілізаваць увагу комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. **Г. Гузьман.**

Імкнуцца замазаць політычны сэнс замах[у]

на самагубства комсамольца Зысэрсона

(Тэлеграма з Віцебску выязной рэдакцыі „Чырвоная Зрмена“)

Для расьсьледваньня факту замаху на самагубства ко[м]самольца-ударніка Зысэрсона на скурзаводзе, аб якім пісал[а] ў „Чырвонай Зьмене“ ад 15-га мая, вылучана камісія 1-[га] райкомам КП(б)Б з удзелам прадстаўніка выязной рэдак[цыі] „Чырвонай Зьмены“. Учора праведзены сходы рабочых д[ру]гой зьмены цэху, дзе працуе Зысэрсон. Сёньня матар'ял аб[га]варваецца на партыйным і комсамольскім сходзе заво[ду]. Частка партыйцаў-комсамольцаў і асабліва адміністрацый[на]-тэхнічнага пэрсоналу імкнулася політычны сэнс справы з[ама]заць (Шчалкалі, Левін Д., Швай, Штэйн, Хэйфец, Чыж).

Праведзены сход рабочых і сход ячэйкі дае падста[ву] сьцьвярджаць, што факты, аб якіх паведамляла „Ч. З.“, [у] асноўным правільныя. Сход ячэйкі ўсё-ж ня даў сваёй по[лі]тычнай ацэнкі факту, спадзяючыся, што ацэнку зробіць ка[мі]сія райкому, чым яшчэ больш паказаў сваё няўменьне ху[тка] і політычна правільна ацэньваць падобныя факты.

АНІШЧУК, СІДАРУК.

У ЦВК БССР

Ход конкурсу на лепшы колгас

Сэкратарыят ЦВК заслухаў інформацыю рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“ аб ходзе конкурсу на лепшы па правядзеньню вясновай сяўбы колгас.

На старонках „Савецкай Беларусі“ фігуруюць 150—200 КОЛГАСАЎ, якія прымаюць удзел у соцыялістычным спаборніцтве. Умовы, якія прыняты колгасамі па дагаварох аб соцспаборніцтве ў асноўным выконваюцца імі. Удзел саветаў і выканкомаў у конкурсе—НЕДАСТАТКОВЫ. СЛАБА ПРЫЦЯГНУТЫ ДА КОНКУРСУ ТАКСАМА І РАБСЕЛЬКОРЫ. Весткі аб падлягаючых прэміяваньню лепшых колгасах павінны паступаць ад раённых штабаў у першых лічбах чэрвеня м-ца.

Сэкратарыят ЦВК прыняў інформацыю газэты „Савецкая Беларусь“ аб конкурсе да ведама. Зьвернута ўвага акрвыканкомаў на большы ўдзел і кіраўніцтве работай па выяўленьню лепшага колгасу. „Савецкай Беларусі“ даручана зьвятляць праз рабселькораўскую сетку становішча і лепшыя прыклады пабудовы новага быту ў колгасах.

УРУЧЭНЬНЕ ПЕРШАЙ ПРЭМІІ ЛЕПШАМУ КОЛГАСУ—ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ І ТРАКТАРУ—БУДЗЕ ДАПАСАВАНА ДА СЬВЯТКАВАНЬНЯ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ.

Цэнтральныя курсы перападрыхтоўцы н[о]вых савецкіх работні[каў]

Сэкратарыят ЦВК пастанавіў весьці ў горадзе Менску з 15 [чэр]веня па 15-ае жніўня г. г. [дво]сячныя цэнтральныя курсы па[д]рыхтоўцы старшынь сельскіх [саве]таў—жанчын на 60 чалавек. [У] жніўні м-цы намяркована пр[авес]ці таксама цэнтральныя курсы [ста]завых савецкіх работнікаў [на ...] чалавек.

Выданьне брашуры - [па]лажэньня пра сель[скія] саветы

Сэкратарыят ЦВК даручыў Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК „вы[даць]“ брашуру—палажэньне пра сел[ьскія] саветы ў колькасьці 10000 [экзэм]пляраў. Гэтыя брашуры б[удуць] разьмеркаваны сярод сельскі[х са]ветаў (з разьліку па 5 на ко[жны]), хат-чытальняў, клюбаў, шко[л, мо]ладзі і інш., а таксама част[ка] паступяць у продаж праз Бел[дзяржа]выдавецтва.

Акруговым і раённым вык[онаў]чым камітэтам даручана пра[весьці] на працягу чэрвеня м-ца г. г. [адна]дзённыя курсы—нарады для [пад]рыхтоўкі і азнаямленьня [чле]наў сельскіх саветаў і нізавога [сялян]скага актыву з новым палажэ[ньнем] аб сельскіх саветах.

Устанаўленьне сталай сувязі з гаспадарчымі і н[ауко]вымі ўстановамі, узнагароджанымі ордэнам Пра[цоў]нага Чырвонага Сьцягу

Сэкратарыят ЦВК прызнаў неабходным устанавіць сталую сувязь і нагляд за дзейнасьцю ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва ўсіх гаспадарчых і навукова-дасьледчых установаў, узнагароджаных Прэзыдыумам ордэнам Чырвонага Сьцягу.

Оргаддзелу і Сэкратарыяту П[рэзы]дыуму ЦВК даручана распр[ацаваць] парадак сувязі і адпаведны [матэрыял] падаць на разгляд Сэкратарыяту.

Паштовая скрынка

БЯРОЗЦЫ—„Кулак выключан са школы“, ЗУСЬМАНУ—„Як правялі маёўку рабочыя заводу „Энэргія“, КОМСАМОЛЬЦУ — „Хто наладзіць працу гуртка „бязбожнік“, АЛЕСЮ ВЯСКОВАМУ—„РК ЛКСМБ, зьвярні ўвагу на гэткую ячэйку!“, КАБАНОВУ—„Праца ячэйкі КСМ“, УДАРНІКУ—„Таксама ўдарнік“, ПРАЛЕСЦЫ—„Нічога ня ведаюць аб гадавіне соцспаборніцтва“, ВІЛЕ—„Аб трохмесячніку беларускай культуры“, АБУШЭНКУ—„Ні аднаго адстаючага“, „ЧАРНЯЎСКАМУ—„Праверка гурткоў па ліквідацыі няпісьменнасьці“, Х. У.—„Заснулі лікпункты“, ЮНКОРУ — „Трохмесячнік беларускай культуры“, ВУЧНЮ—„Лікпункты перасталі працаваць“, ХАЮЦІНУ—„Аб ходзе трохмесячніку пролетарскай культуры“, К. К.—„Вось гэта ўдарнікі“, МІХАСЮ ЗОЛКУ — „Першая ззаду“, МІЛЬЦЭРУ — „Трохмесячнік культуры“, ЛАПЦЮ—„Трохмесячнік белкультуры це праводзіцца“, КОРНІЕНКУ—„Бяз мас“, БОГ[...] „Пасьля заключэньня зноў сп[...]“ БРЫГАДЗІРУ—„Зьнішчым“, ПР[...]НАМУ — „Політычна-няпісьме[нныя]“ ЮНКОРУ—„Ніхто не клапо[ціцца]“ ВАУЧКУ—„Як гэта назваць“, [...]—„План складзен“, БАРСТ[...] „Комсамольцы зрабілі нядзе[...]“ ЛЕВУ — „Мала карысьці“, К[...]МОЛЬСКАМУ ДРУГУ—„Лёгкая [...]рыя, дзе ты?“, КАВАЛЕРЫСТУ[...]метка“, ЧЫРВОНАМУ БОКУ—„[...]ладнае вылучэньне на трактар[...]“ ВУЧНЮ—„Чаму гэта так?“,—Б[РЫГА]ДЗІРУ—«Ударнікі падымаюць [...]цу», ГІРСУ—„Вучнёўскія бры[гады]“, [...]ГОВАРУ — «Організаваліся к[...]» П. К. — „Бяздушныя адносі[ны]“ [...]вашыя довісы друкавацца н[е бу]дуць—дробныя факты.

Адказны рэдакт[ар]
—Рэдкол[егія]

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599